НАРОДНАЕ АНТЫКРЫЗІСНАЕ УПРАЎЛЕННЕ

кааліцыя Латушка Рух ЗА СВАБОДУ

Кароткі агляд

# БІТВА ЗА БЕЛАРУСЬ:

## сістэмная палітыка рэжыму Лукашэнкі па знішчэнню беларускай ідэнтычнасці і прасоўванню «рускага свету»

Варшава, красавік 2026

# Змест


Уводзіны....................................................................................2
1. Барацьба з моўнымі і культурнымі праектамі............................... 3
2. Барацьба з беларускай Вікіпедыяй...............................................5
3. Барацьба з нацыянальнымі пастаноўкамі, фестывалямі і іншымі мерапрыемствамі...................................................................6
4. Барацьба з нацыянальнай літаратурай........................................8
5. Барацьба з беларускім поглядам на гісторыю............................11
6. Барацьба з помнікамі беларускім нацыянальным дзеячам......13
7. Барацьба з беларускімі экскурсаводамі......................................15
8. Барацьба з беларускай мовай у адукацыі.................................. 16
9. Барацьба з надпісамі і шыльдамі на беларускай мове..............19
Вынікі........................................................................................ 21

## Уводзіны

Свет быў уражаны як пасля пачатку поўнамаштабнай агрэсіі Расіі супраць Украіны акупацыйныя ўлады заўзята ўзяліся за выкараненне ўсяго ўкраінскага на захопленых тэрыторыях: знішчэнне ўкраінскай літаратуры, знос помнікаў украінскім нацыянальным дзеячам, сістэмную індактрынацыю ўкраінскіх дзяцей і г.д.

Але мала хто звяртае ўвагу на тое, што практычна такія ж самыя працэсы, у больш марудных і прыхаваных маштабах, асабліва пасля 2020 года ідуць у Беларусі. І гэтыя працэсы рэжым Лукашэнкі альбо пакрывае, альбо нават садзейнічае ім.

Практычна ўсе ўзроўні цяперашняй нелегітымнай улады інфільтраваны агентамі ўплыву так званага "рускага свету". Пасля 2020 года яны яшчэ больш умацавалі свае пазіцыі ва ўладнай вертыкалі рэжыму Лукашэнкі.

Тэхналогія знішчэння беларускасці выглядае наступным чынам. Працэс барацьбы запускаецца праз псеўдаактывістаў грамадзянскай супольнасці (Бондарава, Лушч і т.п.), якія пасылаюць сігналы нелегітымным уладам аб тым, што тыя ці іншыя людзі ці з'явы нібыта нясуць пагрозу рэжыму, але па сутнасці не ўпісваюцца ў рускамірскі наратыў, працуюць на падтрыманне беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці.

Далей агенты “рускага свету” ва ўладзе або сілавых структурах (Карпенкоў, Бедункевіч, Гігін) і нават СМІ (Азаронак, Гладкая) на гэтай падставе пачынаюць пераслед людзей, ліквідацыю аб'ектаў або ўстанаўліваюць новыя забароны на тую ці іншую дзейнасць.

За гэтым працэсам уважліва назіраюць і дзе трэба карэктуюць наглядчыкі-ідэолагі (Дзюкаў, Мяжэвіч), якія ўкараняюць у

грамадскую прастору “рускі” погляд на гісторыю і сучаснасць Беларусі.

Усю гэтую дзейнасць акармляюць, у першую чаргу фінансава, расійскія фонды (Рассупрацоўніцтва, фонд Гарчакова, фонд "Рускі свет"). Дзейнасць усіх разам непасрэдна курыруе пасольства Расійскай Федэрацыі.

А зараз давайце больш падрабязна разгледзім канкрэтныя прыклады такой барацьбы з беларускасцю ў Беларусі.

## 1. Барацьба з моўнымі і культурнымі праектамі

У апошнія гады ў Беларусі назіраецца ўзмацненне ціску на ўсё, што звязана з беларускай мовай і культурай — ад адукацыйных праектаў да медыйных ініцыятыў. Яшчэ ў 2021 годзе курсы "Мова Нанова", папулярны сацыяльна-культурны праект па вывучэнні і распаўсюджванні беларускай мовы, былі ліквідаваны. Афіцыйна прычынай стала "незарэгістраваная сімволіка і лагатып канала Белсат", размешчаныя на сайце курсаў.

Ужо ў 2024 годзе японец Сюнсукэ Сіндо, які пераехаў у Беларусь, у сваім TikTok-блогу распавёў, што спрабаваў знайсці ў Мінску моўную школу, у якой замежнікаў навучалі б беларускай мове. Аднак знайсці такую школу не ўдалося. На сённяшні дзень у Беларусі няма ніводнай моўнай школы, дзе б вучылі нашай мове.

27 мая 2025 года пасля перапынку на YouTube вярнулася праграма «Падарожжа дылетанта» — відэапраект, у якім Юрый Жыгамонт падарожнічае па беларускіх мястэчках, расказваючы пра іх гісторыю, архітэктурныя асаблівасці, мясцовыя традыцыі і легенды. Праграма вядзецца на беларускай мове і з цеплынёй падкрэслівае каштоўнасць нацыянальнай культурнай спадчыны. Аднак прарасейскія прапагандысты Азаронак і Гігін распачалі публічную кампанію цкавання і абвінавацілі аўтара ў антыдзяржаўнай дзейнасці.



Юрый Жыгамонт - вядучы праграмы «Падарожжа дылетанта». Скрыншот відэа

Ад атак прарасійскіх актывістаў перападае нават праўладным дзеячам. 27 снежня 2024 г. стваральніца адзінага праўладнага беларускамоўнага тэлеграм-канала «Верашчака» Зоя Серада напісала, што прыпыняе сваю працу таму, што не мае часу на стварэнне кантэнту, але, магчыма, яна не вытрымала ціску з боку прарасійскіх актывістаў. Яны хэйцяць канал Серады за прабеларускасць, якая атаясамліваецца з русафобіяй.

У 2026 годзе стала вядома пра новыя арышты удзельнікаў культурных ініцыятываў. Напрыклад, людзей з прасторы «Парасон» – якія займаліся традыцыйнымі рамёствамі, лекцыямі па гісторыі Беларусі, беларускім мастацтвам.

Такім чынам, нават умеранае прасоўванне беларускай мовы і беларускай культурнай тэматыкі становіцца аб’ектам варожасці і

палітычнага ціску, што сведчыць пра сістэмнае абмежаванне нацыянальнай ідэнтычнасці.

## 2. Барацьба з беларускай Вікіпедыяй

У Беларусі апошнія гады ўлады актыўна пераследуюць рэдактараў і адміністратараў беларускай Вікіпедыі. У 2025 годзе рэдактарка Вольга Сітнік была асуджаная на 10 сутак арышту, а адміністратар Максім Ляпушэнка затрыманы ў траўні таго ж года. Раней, у снежні 2024 года, быў затрыманы рэдактар Staryj Olup, а з сакавіка 2025 года сувязь з адміністратарам Kazimier Lachnovič перарвалася, мяркуецца ціск ці затрыманне. Падобныя дзеянні ствараюць атмасферу страху сярод удзельнікаў суполкі і перашкаджаюць свабоднай рэдактарскай дзейнасці.

У выніку ў беларускай Вікіпедыі ў ліпені быў зафіксаваны рэкордна нізкі паказчык новых артыкулаў: за месяц быў створаны ўсяго 361 новы артыкул. У верасні гэты паказчык крыху вырас да 569, але ўсё роўна значна ніжэй ранейшых 900–1100 артыкулаў у месяц. Акрамя асабістых пераследаў, дзяржава таксама аказвае ціск на змест Вікіпедыі і абмяжоўвае доступ да матэрыялаў. У прыватнасці, улады абвінавачваюць Вікіпедыю ў прадузятасці і ўмешваюцца ў спрэчныя пытанні. Вядомыя выпадкі крымінальнага пераследу рэдактараў за ўнясенне правак у артыкулы, уключаючы Марка Бернштэйна і Паўла Пернікава.

Пераслед рэдактараў і адміністратараў, абмежаванне кантэнту і зніжэнне актыўнасці супольнасці паказваюць, як дзяржава кантралюе інфармацыйную прастору і абмяжоўвае свабоду слова.

## 3. Барацьба з нацыянальнымі пастаноўкамі, фестывалямі і іншымі мерапрыемствамі

Сістэмная барацьба з нацыянальнымі фестывалямі, тэатральнымі пастаноўкамі і культурнымі мерапрыемствамі таксама дэманструе паступовае прыгнечанне беларускай ідэнтычнасці. Адным з яскравых прыкладаў з'яўляецца адмена спектакля "Тыль" у лістападзе 2021 года. Прэм'ера была адменена пасля таго, як адзін з персанажаў вымавіў фразу "Жыве Фландрыя!", што выклікала негатыўную рэакцыю з боку нелегітымных уладаў. Пасля былі звольненыя рэжысер і акцеры, якія ўдзельнічалі ў пастаноўцы. Да гэтага ў многіх нацыянальных тэатрах краіны прайшлі палітычныя чысткі, якія падарвалі патэнцыял ці нават амаль знішчылі многія тэатральныя трупы.

Але не заўсёды пры адмене мерапрыемстваў ёсць хоць нейкі палітычны складнік. Так, у 2022 годзе каталіцкая абшчына Беларусі выказала заклапочанасць наконт адмены міжнароднага фестывалю духоўнай музыкі "Магутны Божа", які раней праходзіў у краіне. У разгромленным Купалаўскім театры ўсе часцей ідуць пастаноўкі на рускай мове, чаго раней амаль не было. Гэта праблема тычыцца і іншых тэатраў краіны.

1 снежня 2024 г. у дзяржаўным літаратурным музеі імя Янкі Купалы ў Мінску павінна была адкрыцца выстава жывапісу Алеся Сушы «Добры вечар добрым людзям!». Мэта выставачнага праекта — прадставіць даўнія звычаі і абрады беларусаў. Аднак пасля даносу прарасійскіх актывістыў выставу беспрычынна адмянілі. Таксама прарасійскіх актывістыў не задаволіла тое, што на музеі беларускага пісьменніка і паэта Янкі Купалы няма ніводнай шыльды, напісанай па-руску.



*«Вольныя Купалаўцы»— незалежная тэатральная група, былая трупа Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы ў Мінску. Фота: facebook.com/kupalaucy*

З 25 студзеня па 5 траўня 2024 г. у Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры мусіла праходзіць літаратурна-мастацкая выстава, прысвечаная 100-годдзю народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава. Але выстава пратрымалася ўсяго 10 дзён, яе закрылі 5 лютага.

Беларускі ПЭН-цэнтр паведамляў, што фестываль «Свята сонца», які праводзіцца ў Дудутках з нагоды ночы Купалы, не адбудзецца ў 2025 годзе - дазвол на яго быў адкліканы. Падставай стала крытыка з боку прарасійскай актывісткі, якая заявіла, што фестываль — "неапаганскі шабаш са свастыкамі і рунамі". Таксама БЕЛТА выдаліла з сайта публікацыю аб фестывалі.

Але не заўсёды агенты "рускага свету" ў сваёй барацьбе атрымліваюць перамогі. Так, нягледзячы на спробы адмены, у чэрвені 2025 г. фестываль «Свята сонца» ў Дудутках усё ж правялі. У праграме былі абрады, канцэрт, пляценне вянкоў, танцы, выступленні нацыянальна-арыентаваных калектываў. Хаця некаторыя мерапрыемствы ўдаецца захаваць, ціск на арганізатараў і абмежаванні з боку ўладаў і прарасійскіх актывістаў становяцца пастаяннай практыкай.

Адмена спектакляў і фестываляў, ціск на арганізатараў і цэнзура дэманструюць паступовае прыгнечанне культурнай самабытнасці і нацыянальных традыцый.

## 4. Барацьба з нацыянальнай літаратурай

У спіс “экстрэмісцкіх матэрыялаў” унеслі нямала мастацкіх, гістарычных і навуковых твораў, перш за ўсё на беларускай мове і аб праблемах беларускай гісторыі, у тым ліку 9 выпускаў часопіса “Наша гісторыя” і тры выпускі АРХЕ за 2018–2020 гады. Больш за 10 беларускіх кніг былі абазначаны як «экстрэмісцкія матэрыялы». Гэта працы Анатоля Тараса, кніга Вадзіма Дзеружынскага “Забытая Беларусь”; "Нацыянальнае і культурнае жыццё ў Беларусі ў час вайны (1941–1944)" Леаніда Лыча, манаграфія Святланы Казловай «Аграрная палітыка нацыстаў у Заходняй Беларусі: Планаванне. Забеспячэнне. Ажыццяўленне (1941-1944 гг.)» і інш. Спіс забароненых у Беларусі кніг адкрываюць “Нарысы гісторыі Беларусі (1795–2002)”, якую напісаў вядомы беларускі гісторык Захар Шыбека. 14 кастрычніка 2024 г. судом Баранавіцкага раёна і г. Баранавічы прызнана экстрэмісцкім навукова-папулярнае выданне “Ластоўскі Вацлаў. Выбраныя творы”.

“Экстрэмісцкімі” таксама становяцца і выданні мастацкай літаратуры, напрыклад двухтомны збор твораў беларускага класіка Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, выпушчаны

дзяржвыдавецтвам «Мастацкая літаратура». Яшчэ раней былі прызнаныя «экстрэмісцкімі матэрыяламі» прадмова Язэпа Янушкевіча да кнігі Дуніна-Марцінкевіча з серыі «Беларускі кнігазбор», а таксама вершы класіка «Плывуць вятры» і «Гутарка старога дзеда». Таксама ў «экстрэмісцкі» спіс патрапілі кнігі «Беларускага кнігазбору» — творы Уладзіміра Някляева, Ларысы Геніюш, Наталлі Арсенневай і Лідзіі Арабей, "Апошняя кніга спадара А." Альгерда Бахарэвіча.




Літаратура, унесеная ў 2025 годзе ў «Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў». Фота: penbelarus.org

Па патрабаванні пракуратуры «экстрэмісцкія» выданні прыбіраюць з продажу і адбіраюць з бібліятэк. У 2023 годзе стала вядома, што раман Уладзіміра Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім» па патрабаванні Гігіна знялі са школьнай праграмы.

Ліквідаваны два выдавецтвы, якія выпускаюць літаратуру на беларускай мове: Янушкевіч і Кнігазбор. Сайт інтэрнэт-бібліятэкі Kamunikat прызналі "экстрэмісцкімі матэрыяламі" і заблакавалі. Праект, які нарадзіўся на Падляшшы і створаны беларусамі

Польшчы на працягу 25 гадоў спецыялізуецца на беларускай літаратуры.

У лютым 2026 года прайшла хваля вобыскаў і затрыманняў кнігавыдаўцоў і распаўсюджвальнікаў кніг. Былі затрыманыя, сярод іншых, Вацлаў Багдановіч, заснавальнік выдавецтва "Тэхналогія", Андрэй Кім, вядомы перакладчык і аўтар праекта "Кінаконг", Дзмітрый Колас, кіраўнік аднайменнага выдавецтва, а таксама кнігараспаўсюджвальнік Алесь Яўдаха. Адразу пасля гэтых арыштаў незалежныя выдавецтвы пачалі масава прызнавацца «экстрэмісцкімі», у тым ліку і такія, якія да гэтага часу лічыліся бяспечнымі. Сярод іх – Gutenberg Publisher, літаратурна-праваабарончая арганізацыя Беларускі ПЭН, а таксама выдавецтвы "Фонд Kamunikat.org", Lohvinau Publishing House, Andrei Yanushkevich Publishing.




Раман “Каласы пад сярпом тваім” Уладзіміра Караткевіча, выданне 2017 года. Фота: lohvinau.by

У 2024 годзе у нашай краіне было выпушчана толькі 893 найменні кніг і брашур на беларускай мове. У той жа час яшчэ ў 2019 годзе

ў Беларусі выдавалася 1271 найменне. Агульны тыраж на роднай мове за гэты час упаў амаль на 700 тысяч экземпляраў.

Ліквідацыя выдавецтваў, унясенне кніг у пералік “экстрэмісцкіх матэрыялаў” і скарачэнне колькасці публікацый прыводзіць да эрозіі беларускай культурнай памяці і літаратурнай спадчыны.

## 5. Барацьба з беларускім поглядам на гісторыю

Барацьба з беларускім поглядам на гісторыю ў Беларусі стала адным з ключавых элементаў дзяржаўнай ідэалогіі рэжыму Лукашэнкі, асабліва пасля 2020 года. Нелегітымныя ўлады імкнуцца зацвердзіць адзіную інтэрпрэтацыю мінулага, заснаваную на савецкай спадчыне і ідэях “рускага свету”. Для кантролю над гісторыяй распараджэннем Лукашэнкі ад 4 лютага 2022 года пры адміністрацыі прэзідэнта быў створаны Рэспубліканскі савет па гістарычнай палітыцы, у якой акрамя гісторыкаў увайшлі чыноўнікі і вядомыя прапагандысты.

Акрамя таго, прыняты 5 студзеня 2022 года закон Рэспублікі Беларусь «Аб генацыдзе беларускага народа» дазваляе перасследваць за трактоўкі гісторыі, якія адрозніваюцца ад афіцыйных. У адукацыі, навуцы і грамадскай прасторы актыўна прасоўваецца наратыў, у якім гісторыя Беларусі разглядаецца як частка агульнага мінулага з Расіяй, а любыя спробы падкрэсліць еўрапейскі вектар або незалежнасць ад Расіі прадстаўляюцца як фальсіфікацыя.

Эпоха Рэчы Паспалітай характарызуецца як «цяжкае выпрабаванне для беларусаў», а з уваходжаннем тэрыторый сучаснай Беларусі ў склад Расійскай імперыі звязваюць эканамічную мадэрнізацыю і працяглы мірны перыяд, які садзейнічаў «развіццю нацыянальна-духоўных традыцый».



Пасяджэнне Рэспубліканскага савета па гістарычнай палітыцы. Фота: sb.by

Перыяд Беларускай Народнай Рэспублікі фактычна сцёрты з афіцыйнай памяці. Бела-чырвона-белы сцяг і «Пагоня» прызнаныя «экстрэмісцкімі» сімваламі. У адукацыйных і дзяржаўных выданнях Беларуская Народная Рэспубліка прадстаўлена як негатыўная альтэрнатыва савецкаму праекту, што падмяняе вытокі беларускай дзяржаўнасці.

Беларусь уключана ў адзіны наратыў Саюзнай дзяржавы. Сімвалы Расійскай імперыі дамінуюць у падручніках і публічнай прасторы, у той час як нацыянальна-вызваленчыя рухі, такія як паўстанне Каліноўскага, маргіналізуюцца.

У Беларусі працягваецца пераслед гісторыкаў, для многіх з якіх нелегітымная ўлада ўвяла фактычную забарону на прафесію. За пяць гадоў больш за 50 даследчыкаў былі звольненыя або вымушаныя з'ехаць. Прычына не толькі ў прафесійнай дзейнасці, але і ў выкарыстанні беларускай мовы, грамадзянскай пазіцыі. Доступ да архіваў і магчымасць публікацый

абмежаваныя, а многія гістарычныя праекты прызнаныя «экстрэмісцкімі».

У лютым 2024 года пасол Расіі ў Мінску Барыс Грызлоў заявіў, што рэжым Лукашэнкі і Крэмль дамовіліся аб стварэнні адзіных падручнікаў па гісторыі для школ і вышэйшых навучальных устаноў. Ужо ў чэрвені 2025 года міністр асветы Расіі Сяргей Краўцоў пасля сустрэчы прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна з аўтарамі адзіных падручнікаў па гісторыі паведаміў, што адзіны школьны дапаможнік па гісторыі Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі можа з'явіцца ў вучэбнай праграме ў 2026–2027 гадах.

Такім чынам, перагляд гістарычнага наратыву і пераслед незалежных даследчыкаў з’яўляюцца адной з формаў ідэалагічнага падпарадкавання Беларусі Расіі. Укараненне адзіных падручнікаў і крыміналізацыя неафіцыйных трактовак мінулага накіраваны на выхаванне пакалення без нацыянальнай памяці, для якога Беларусь будзе ўспрымацца не як самастойная дзяржава, а як правінцыйны складнік «рускага свету».

## 6. Барацьба з помнікамі беларускім нацыянальным дзеячам

У 2025 годзе бюст Касцюшкі, устаноўлены ў Малых Сяхновічах (Брэсцкая вобласць), быў дэмантаваны рашэннем мясцовага райвыканкама. Таксама знікла мемарыяльная таблічка, прысвечаная Касцюшку, з памятнай каменнай пліты каля вёскі Касцюшкава (Горацкі раён, Магілёўская вобласць). Усталяваная ў гонар Тадэвуша Касцюшкі ў красавіку 2024 года памятная дошка дэмантавана са сцяны Новага замка ў Гродне. Дошку ўстанавілі яшчэ ў 1994 годзе да 200-годдзя паўстання пад кіраўніцтвам Касцюшкі ў 1794 годзе.

6 снежня 2023 г. Свіслацкая гімназія №1 была пазбаўлена імя кіраўніка паўстання 1863–1864 гг. Кастуся Каліноўскага. Гэта

была адзіная ўстанова адукацыі ў Беларусі, якая насіла імя нацыянальнага героя краіны.

У Зэльве (Гродзенская вобласць) на тэрыторыі царквы Святой Жываноснай Тройцы стаяў бюст паэткі-дысідэнткі Ларысы Геніюш, устаноўлены ў 2003 годзе. Уначы на 30 сакавіка 2023 года яго дэмантавалі без публічнай аб'явы. Дэмантаж адбыўся пасля кампаніі па яе дыскрэдытацыі з боку зноў жа прарасейскіх актывістаў.



Прамова Памочніка Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі і Старшыня Расійскага ваенна-гістарычнага таварыства Уладзіміра Мядзінскага на адкрыцці помніка Аляксандру Неўскаму ў Мінску. Фота: belarus.mid.ru

Адначасова ў Беларусі ўсё часцей устанаўліваюцца помнікі расійскім гістарычным дзеячам. 14 лістапада 2023 года ў Мінску, на плошчы ля пасольства Расіі, быў адкрыты помнік князю Аляксандру Неўскаму. Манумент уяўляе сабой конную скульптуру вышынёй 11 метраў і быў створаны пры падтрымцы

Аляксандра Лукашэнкі, пасольства Расіі і Беларускага экзархата Рускай праваслаўнай царквы.

Нядаўна рэжым прадставіў спіс тых, хто павінен увайсці ў "пантэон нацыянальных герояў". На фасадзе новага будынка Нацыянальнага гістарычнага музея збіраюцца размясціць шэсць барэльефаў з найбольш важнымі, на думку лукашэнкаўскіх чыноўнікаў, імёнамі. І хоць у ім сапраўды шмат знакавых для краіны асоб, многія вядомыя дзеячы гісторыі Беларусі перыяду Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай і БНР выкраслены з яго. Там мы не знойдзем нікога, хто хоць неяк змагаўся з Расіяй за нашыя нацыянальныя інтарэсы.

Адначасовы дэмантаж помнікаў беларускім гістарычным і культурным дзеячам і ўсталяванне помнікаў расійскім гістарычным фігурам сімвалічна адлюстроўвае змену гістарычнага парадку і сімвалізуе ідэалагічную пераарыентацыю.

## 7. Барацьба з беларускімі экскурсаводамі

У апошнія гады нелегітымныя ўлады таксама ўзмацнілі кантроль над экскурсаводамі, ператварыўшы гэтую сферу ў аб'ект ідэалагічнага нагляду. З 1 студзеня 2023 года ўступіў у сілу абноўлены Кодэкс аб культуры - па ім экскурсаводы і гіды-перакладчыкі абавязаны праходзіць прафесійную атэстацыю. Сярод крытэрыяў - "гістарычная дакладнасць", пэўныя патрабаванні да палітычнай лаяльнасці.

Экскурсаводаў абавязалі ведаць асновы дзяржаўнай ідэалогіі, садзейнічаць «прызнанню ўнікальнасці беларускай мадэлі грамадскага развіцця». Не дапускаюцца да атэстацыі людзі з судзімасцю за артыкулы, звязаныя з "абразай улады". Ад экскурсаводаў патрабуюць даносіць скажоную карціну мінулага, міфы ў рэчышчы ідэалогіі “рускага свету”.

У 2022-2023 гадах былі прыняты пастановы і змены, якія павялічваюць адказнасць экскурсаводаў, узмацняюць кантроль над экскурсійным абслугоўваннем. Патрабуецца, каб экскурсавод меў бэйдж, пералік тых тэм, па якіх ён атэставаны, пазбягаў "некарэктных выказванняў".

Экскурсаводку Святлану Грышкевіч затрымалі проста падчас экскурсіі ў Мінску за «некарэктную заўвагу» на адрас Лукашэнкі. Як мяркуецца, усё з-за даносу. Іван Сацукевіч і Алесь Варыкіш былі затрыманыя разам з турыстамі на шляху на абрад "Калядныя цары". Адзін з іх адсядзеў 15 сутак, іншы - 10.

Аксана Манкевіч і Ігар Хмара затрымліваліся і пацярпелі ад судовага пераследу: Манкевіч, напрыклад, абвінавачвалася, што экскурсанты нібыта пікетавалі, Хмара — за «скажэнне гістарычных фактаў» і за тое, што размаўляў па-беларуску. Часцей за ўсё такія справы пачынаюцца на аснове даносаў агентаў уплыву "рускага свету". Напрыклад, прапагандыстка Людміла Гладкая запатрабавала ад сілавікоў разабрацца з экскурсаводамі, якія "не так" раскрываюць тэмы партызанскай вайны.

Такім чынам, рэпрэсіі і абмежаванні супраць экскурсаводаў сталі часткай агульнай палітыкі задушэння незалежнага погляду на гісторыю і культуру Беларусі.

## 8. Барацьба з беларускай мовай у адукацыі

У 1994/1995 навучальным годзе ў Менску 58% першакласнікаў вучыліся па-беларуску. Аднак з прыходам да ўлады Аляксандра Лукашэнкі ў 1994 годзе гэтая лічба пачала імкліва паніжацца. Да 1999 года ўсяго 5,3% менскіх першакласнікаў атрымлівалі адукацыю на беларускай мове.

Тэндэнцыя да скарачэння беларускамоўных школ працягнулася і ў наступныя дзесяцігоддзі. У 2016-2017 навучальным годзе па

ўсёй краіне каля 128 тысяч вучняў вучылася на беларускай мове, што складала прыкладна 13,3% ад агульнай колькасці школьнікаў. Пры гэтым большасць такіх школ знаходзілася ў сельскай мясцовасці, дзе з-за паступовага скарачэння насельніцтва штогод закрывалася каля 100 невялікіх школ, многія з якіх былі беларускамоўнымі.




Распаўсюджванне рускай і беларускай моў у Беларусі, паводле даных афіцыйнай перапесі насельніцтва 2019 года. Крыніца: wikipedia.org

8 студзеня 2025 года адна з прарасійскіх актывістак апублікавала ў сацыяльных сетках пост, у якім раскрытыкавала адукацыю на беларускай мове. Паводле яе сцвярджэння, навучанне на беларускай нібыта абмяжоўвае магчымасці выпускнікоў

паступаць у тэхнічныя ВНУ. У якасці аргументу яна спаслалася на неабходнасць падрыхтоўкі спецыялістаў для вытворчасці тавараў падвойнага прызначэння, адзначыўшы: "вайна на парозе, а спецыялістаў няма".

У Беларусі пад кіраўніцтвам Лукашэнкі назіраецца паступовае скарачэнне колькасці школ і класаў з навучаннем на беларускай мове. У 2020-х працэс русіфікацыі адукацыі яшчэ больш пачаў набіраць абароты. Асабліва гэта заўважна пасля падзей 2020 года і ўзмацнення ўплыву Расіі на Беларусь. У 2020 годзе Міністэрства адукацыі заявіла, што ў Беларусі больш за 45% школ - беларускамоўныя. Але ўжо праз тры гады гэтая доля афіцыйна знізілася да 40%, што сведчыць аб паступовым знікненні нацыянальнай адукацыі нават па афіцыйных дадзеных. Міністр адукацыі Андрэй Іванец у 2023 годзе паведаміў, што на беларускай мове навучаецца толькі каля 10% школьнікаў. Ён прызнаў, што большая частка беларускамоўных школ знаходзіцца ў сельскай мясцовасці, дзе колькасць вучняў паступова скарачаецца.

Беларускамоўныя школы сёння захаваліся пераважна ў вёсках, але з-за малой колькасці вучняў многія з іх паступова закрываюцца. У гарадах жа сітуацыя яшчэ горшая: у некаторых няма ніводнага беларускамоўнага класа. У большасці школ беларуская мова прысутнічае толькі як прадмет, у той час як іншыя дысцыпліны, у тым ліку гісторыя Беларусі, выкладаюцца па-руску.

Па стане на 2023 і 2024 навучальныя гады поўнасцю беларускамоўныя школы захаваліся толькі ў Мінску. У раённых цэнтрах беларускамоўная адукацыя засталася ў дзвюх школах: у гімназіі №2 у Барысаве і школе №4 у Іванава Брэсцкай вобласці.

Некаторыя школы, якія раней былі беларускамоўнымі, пераходзяць на рускую мову навучання. Напрыклад, глыбоцкая

школа №3 з 2006 года стала двухмоўнай, а навагрудская гімназія №1, дзе вучыўся і выкладаў вядомы беларускі вучоны Барыс Кіт, цалкам перайшла на рускую мову.

Паступовае скарачэнне беларускамоўных школ і класаў прыводзіць да знікнення нацыянальнай адукацыі, зніжэння ўплыву мовы і аслаблення культурнай ідэнтычнасці ў будучыні.

## 9. Барацьба з надпісамі і шыльдамі на беларускай мове

У Беларусі назіраецца сістэматычнае выцісканне беларускай мовы з грамадскай прасторы, пачынаючы ад транспарту і вулічных надпісаў і сканчваючы афіцыйнымі дакументамі.

Так, адмены беларускай лацінкі ў транспарце сталіцы актыўна дабіваліся прарасійскія актывісты. У выніку па стане на 2023 год амаль на ўсіх аўтобусных прыпынках у Мінску замест беларускай лацінкі з’явіліся надпісы на рускай мове. У пачатку кастрычніка 2023 г. у Гродна таксама дэмантавалі вулічныя паказальнікі з лацінкай.

Але барацьба ідзе не толькі з лацінкай, але і з надпісамі і аб’явамі ўласна на беларускай мове, нават кірыліцай. У кастрычніку 2023 г. у маладзечанскіх электрычках перасталі абвяшчаць прыпынкі па-беларуску. З прыёмнікаў у вагонах гучыць толькі руская мова. У тым жа месяцы на гродзенскім аўтавакзале таксама зніклі галасавыя абвесткі па-беларуску. У верасні 2024 г. стала вядома, што ў Нясвіжы беларускамоўныя вулічныя шыльды замянілі на рускамоўныя.




Надпісы на беларускай лацінцы ў мінскім метро, 2020 год. Фота: minsknews.by

Але нават замежныя турысты, нават з Расіі часта не разумеюць такога грэблівага стаўлення да беларускай мовы ў Беларусі. Так, у жніўні 2024 г. на сваёй старонцы ў інстаграм турыстка з Расіі абурылася тым, што ў Беларусі ўсе назвы напісаныя па-руску і няма беларускай мовы. У той самы час высветлілася, што прарасійскія актывісты звярнуліся ў Мінсктранс з патрабаваннем, каб прыпынкі ў транспарце абвяшчалі па-руску.

Змены адбываюцца не толькі ў траспартце, але шыльды і надпісы на помніках таксама мяняюць на рускамоўныя. У жніўні 2023 г. на Вайсковых могілках у Мінску старое надмагілле беларускага паэта і мовазнаўцы Алеся Гурло (1892–1938) было зменена на сучаснае, аформленае па-руску. І гэта не адзіны прыклад. Тое самае тычыцца мгогіх іных сфер. Так, на сенняшні дзень толькі 1,4% прававых актаў Беларусі маюць версію на беларускай мове.

У той жа самы час ужо былы міністр інфармацыі, а зараз міністр культуры Марат Маркаў сцвярджаў, што размовы аб прыгнёце беларускай мовы нібыта нясуць «экстрэмісцкія ідэі». Такім

чынам, русіфікацыя грамадскай і афіцыйнай сферы сведчыць пра цэнтралізаванае абмежаванне выкарыстання беларускай мовы і зніжэнне яе бачнай прысутнасці ў жыцці краіны, а спробы падымаць праблему ў грамадскім дыскурсе купіруюцца.

## Вынікі

Праведзены аналіз сведчыць аб тым, што ў Беларусі фарміруецца сістэмная палітыка па прыгнечанні нацыянальнай ідэнтычнасці, беларускай мовы, культуры і гістарычнай памяці. Працэсы, якія назіраюцца ў краіне, уключаюць пераслед актывістаў і культурных дзеячаў, кантроль над інфармацыйнай прасторай, забароны на нацыянальныя мерапрыемствы, ліквідацыю выдавецтваў і публікацый на беларускай мове, а таксама знішчэнне помнікаў беларускім гістарычным і культурным фігурам. Усе гэтыя меры суправаджаюцца паступовай русіфікацыяй адукацыі і ўзмацненнем уплыву структур, звязаных з так званым "рускім светам".

Асаблівую ўвагу трэба надаць таму, што гэтыя працэсы носяць сістэмны і шматслойны характар: уздзеянне ажыццяўляецца праз прарасійскіх лабістаў ў дзяржаўных структурах, праз псеўда-актывістаў грамадзянскай супольнасці і пад кантролем ідэолагаў, якія каардынуюць укараненне "рускага" погляду на гісторыю і сучаснасць Беларусі. Расійскія фонды і дыпламатычныя структуры аказваюць прамы ўплыў на фарміраванне культурнага і інфармацыйнага парадку дня краіны.

Сітуацыя з беларускай мовай у адукацыі і грамадскай прасторы, абмежаваннем дзейнасці беларускай Вікіпедыі і незалежных экскурсаводаў, забаронай нацыянальных фестываляў і тэатральных пастановак, культурных і моўных ініцыятыў, выданняў на беларускай мове, дэмантажом помнікаў

гістарычным і культурным дзеячам паказвае, што працэс знішчэння беларускасці ідзе сістэмна і паслядоўна. Нават нягледзячы на асобныя поспехі нацыянальна арыентаваных ініцыятыў, агульны кірунак палітыкі вядзе да эрозіі культурнай самабытнасці і гістарычнай памяці.

Такім чынам сучасная Беларусь сутыкаецца з пагрозай паступовага знікнення ключавых элементаў сваёй нацыянальнай ідэнтычнасці. Для захавання беларускай культуры, мовы і гістарычнай памяці неабходна кансалідацыя грамадства вакол абароны нацыянальнай спадчыны і выпрацоўка стратэгій, як на узроўні дэмакратычных сіл Беларусі (Аб’яднаны Пераходны Кабінет Беларусі і Каардынацыйная Рада), так і Еўрапейскага саюза, якія дазваляюць супрацьстаяць знешняму і ўнутранаму ціску на беларускую ідэнтычнасць.

Каб спыніць сістэмнае знішчэнне беларускай ідэнтычнасці неабходны наступныя крокі:

1. Палітычныя і санкцыйныя меры (Ціск на агентаў «рускага свету»)

- Персанальныя санкцыі: увядзенне строгіх абмежаванняў супраць чыноўнікаў, ідэолагаў і прапагандыстаў, якія непасрэдна кіруюць рэпрэсіямі супраць беларускай мовы, гісторыі і культуры.
- Афіцыйнае прызнанне праблемы на ўзроўні ЕС: прыняцце рэзалюцый Еўрапарламента і ПАСЕ, якія б афіцыйна асуджалі палітыку русіфікацыі як спробу этнацыду і пагрозу рэгіянальнай бяспецы.
- Блакіроўка расійскага ўплыву: санкцыі супраць расійскіх фондаў, якія фінансуюць русіфікацыю і антыбеларускую дзейнасць.

2. Падтрымка беларускай культуры і мовы (інстытуцыйная дапамога)

- Стварэнне Еўрапейскага фонду падтрымкі беларускай культуры: Выдзяленне мэтавых грантаў для незалежных выдавецтваў, тэатральных труп і музыкаў, якія былі вымушаныя з'ехаць з краіны. Гэта дапаможа захаваць выданне кніг на беларускай мове.
- Узмацненне прысутнасці мовы ў IT-сферы: падтрымка праектаў па перакладзе інтэрфейсаў сусветных лічбавых прадуктаў і сэрвісаў на беларускую мову, каб яна заставалася жывой у лічбавай прасторы.
- Абарона лічбавай спадчыны: фінансаванне маштабнай алічбоўкі беларускіх архіваў, кніг і музейных калекцый з размяшчэннем іх на абароненых еўрапейскіх серверах.

3. Адукацыйныя ініцыятывы (фарміраванне будучыні)

- Стварэнне анлайн-сістэмы нацыянальнай адукацыі: распрацоўка паўнавартаснай, акрэдытаванай у ЕС платформы для дыстанцыйнага навучання школьнікаў і студэнтаў на беларускай мове. Гэта дасць магчымасць дзецям унутры Беларусі атрымліваць веды без ідэалагічнай апрацоўкі.
- Пашырэнне стыпендыяльных праграм: павелічэнне квот для беларускіх студэнтаў і даследчыкаў (па прыкладзе праграмы Каліноўскага Ўрада Польшчы), асабліва для тых, хто займаецца беларускай філалогіяй і гісторыяй.
- Падтрымка моўных школ у дыяспары: Фінансаванне курсаў беларускай мовы для дзяцей эмігрантаў, каб пазбегнуць іх асіміляцыі за мяжой.

4. Інфармацыйнае супрацьдзеянне і абарона актывістаў

- Падтрымка стваральнікаў кантэнту: гранты для беларускамоўных YouTube-каналаў, TikTok-блогераў і культурніцкіх праектаў. Гэта неабходна для стварэння якаснай альтэрнатывы расійскай прапагандзе.
- Абарона рэдактараў Вікіпедыі: юрыдычная і тэхнічная дапамога адміністратарам беларускай Вікіпедыі, а таксама стварэнне інструментаў для бяспечнага рэдагавання артыкулаў.
- Падтрымка незалежных СМІ: доўгатэрміновае фінансаванне медыя, якія працуюць на беларускай мове і выкрываюць працэсы культурнай экспансіі Расіі.